# Вялікі талент, вялікая работа, вялікае сэрца

*14 лютага ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбыліся творчая сустрэча "Вялікі талент, вялікая работа, вялікае сэрца" і прэзентацыя кніжна-ілюстрацыйнай выставы, прысвечаныя лаўрэатам прэміі "За духоўнае адраджэнне" і спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2012 года.*

►►► 2 стар.

# Вялікі талент, вялікая работа, вялікае сэрца

◄◄◄ 1 стар.

За апошнія гады гэта ўжо стала адмысловай традыцыяй у традыцыі — праз нейкі час пасля ўрачыстай цырымоніі ганаравання лаўрэатаў прэміі "За духоўнае адраджэнне" і спецпрэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва ладзіць больш камерныя сустрэчы з імі ў сценах Нацыянальнай бібліятэкі з тым, каб яны маглі расказаць шырокай грамадскасці не толькі пра свае дасягненні ў пэўным годзе, але і наогул пра сябе як творцаў, пра свае творчыя планы. Адметна, што на сёлетнюю сустрэчу "Вялікі талент, вялікая работа, вялікае сэрца" сабралася асабліва шмат навучэнскай моладзі. Да іх, маладых і юных, у першую чаргу і звярталіся запрошаныя лаўрэаты, калі гаварылі пра тое, чаму яны любяць сваю работу, калі дзяліліся сакрэтамі поспеху.

У прыватнасці, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі, доктар педагагічных навук, прафесар Раман Матульскі (калектыў НББ быў удастоены спецпрэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь) паспрабаваў парушыць пашыраны ў асяроддзі маладых людзей стэрэатып так званага замкнёнага кола, маўляў, ёсць матэрыяльныя сродкі — будзе і поспех, а няма сродкаў — нічога ў гэтым жыцці не здзейсніш. "Заўсёды здаецца, што для рэалізацыі нейкага праекта не хапае грошай. На самай справе гэта не так. Усё якраз наадварот: была б слушная ідэя, быў бы чалавек, які гарыць гэтай ідэяй! А сродкі заўсёды знойдуцца, тым больш што ў нашай краіне сёння ёсць людзі, гатовыя падтрымліваць важныя і карысныя культурныя праекты", — адзначыў Раман Сцяпанавіч.

З вялікай цікавасцю прысутныя таксама слухалі намесніка дырэктара Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Валерыя Гедройца, якія акцэнтаваў у сваім выступленні неабходнасць увядзення як мага больш нацыянальных твораў у рэпертуар тэатра. Вядомы кінарэжысёр вышэйшай катэгорыі студыі "Летапіс" уладальнік шматлікіх кінематаграфічных прызоў Галіна Адамовіч дастаткова нечакана канстатавала, што нават у дакументальным кіно бывае розная праўда, бо кожны фільм — гэта асобны чалавек, асобны суб'ектыўны погляд і, зрэшты, гэта і ёсць самае цікавае ў кінематографе. Яна ж прызналася, што найбольш складанай са сваіх карцін лічыць "Инокиню", а, напрыклад, фільм "Маляваны рай" найперш цікавы тым, што распавядае пра жанчыну-мастачку Алену Кіш, якая малявала рай для людзей, якія пра гэты рай у даваенныя і пасляваенныя гады маглі толькі марыць. Рэжысёр таксама заўважыла, што наогул у тыя часы, асабліва ў вясковым асяроддзі, быць для жанчыны мастачкай або музыкай было быццам ганебна, сорамна, бо не прынята. "Гэтая акалічнасць робіць фігуру Алены Кіш яшчэ больш загадкавай і знакавай. Я думаю, што яе жыццё магло б стаць вельмі ўдзячным матэрыялам і для мастацкага кіно". Прысутныя мелі магчымасць паглядзець зняты Галінай Адамовіч фільм "Маляваны рай".

Падчас сустрэчы "Вялікі талент, вялікая работа, вялікае сэрца" таксама выступілі артысты тэатра-студыі кінаакцёра рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства "Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм", загадчык кафедры харавога і вакальнага мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Альбіна Пякуцька і інш. Шчырымі гучнымі авацыямі канферэнц-зала Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі сустракала выдатныя творчыя нумары: арыю з оперы Д.Смольскага ў выкананні салістаў Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, урывак са спектакля "Хто смяецца апошнім" па п'есе К.Крапівы ў выкананні артыстаў тэатра-студыі кінаакцёра рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства "Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм", выступленні студэнтаў прафесара Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Яўгена Гладкова і харавога калектыву БДУКіМ пад кіраўніцтвам Альбіны Пякуцька.

У кальцавым калідоры на другім па[версе] Нацыянальнай бібліятэкі Бела[русі] разгарнулася кніжна-ілюстрацыйная выстава, дзе на дзевяці стэндах прадстаўлены шматлікія матэрыялы з фондаў бібліятэкі аб лаўрэатах: кнігі, плакаты, фота, перыядычныя выданні. Экспазіцыя будзе працаваць да 17 красавіка.

**Мікола ЧЭМЕР.**

*gilevitch@ng-press.by*